***Шэйка І.М.***

***Беларуская літаратура, 5 клас***

***Тэма:*** Якуб Колас **“Нарэчцы”.** Выяўленне паўнаты і радасці жыцця праз вобразы і інтанацыйны лад твора

***Задачы:***

* садзейнічаць спасціжэнню паўнаты і радасці жыцця праз вобразы і інтанацыйны лад твора, прааналізаваць сродкі мастацкага выяўлення ў творы, удасканальваць навыкі выразнага чытання паэтычных прырода-апісальных тэкстаў;

* развіваць уменне складаць цытатны план сюжэтнага вершаванага твора;

* выхоўваць паважлівыя адносіны да роднай зямлі, прыроды, цікавасць да паэтычных твораў.

***Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:*** вучэбны дапаможнік, ч.1; рабочы сшытак; Тэматычны кантроль; партрэт Я Коласа; выстава кніг пісьменніка; карткі з заданнямі.

https://eior.by/catalog_lecture/5-klass/bellit/25.php

*Эпіграф: Пад пялёнкай белай*
*Травы і лісточкі.*
*Рэчка анямела,*
*Змоўклі ручаёчкі.*
*Анямелі лозы,*
*Чуць галлём хістаюць.*
*А ў палях марозы*
*Ды вятры гуляюць.*

*Якуб Колас*

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант.**

Стварэнне псіхалагічнага настрою вучняў на працу.

Празвінеў званок і змоўк –
Пачынаецца ўрок.
Слухаем, запамінаем,
Ні хвілінкі не губляем.

**II. Праверка дамашняга задання.**

Выразнае чытанне урыўка Я.Коласа “На рэчцы”.

Карэкцыя памылак.

**III. Мэтаматывацыйны этап.**
Аналіз эпіграфа да ўрока, вывад.

- Як вы лічыце:

- Пра што мы з вамі будзем гаварыць наўроку?
- Чым будзем займацца?
- Што будзем вывучаць?
- Што трэба ведаць?
- Што трэба ўмець?

**Гімнастыка для вачэй:**
Улева – управа, улева – управа
Вачыма рухаем мы жвава.
Вочы ўгору разам узнялі,
Вейкамі ўсім памірга́лі.
-Адпачылі?
-Адпачылі!
І да працы прыступілі.

**IV. Самастойная работа вучняў.** *(Праверка і карэкцыя памылак)*

1. ***Адзначце правільны адказ***
   1) *Які з пералічаных твораў не належыць Я.Коласу?*
- “Адлёт журавоў” * “Дрымотна ціснуцца кусты” *“Крынічка”.
   2) *Якая пара годабыла самай любімай у галоўнага героя твора Я.Коласа “На рэчцы”?*
- Восень * лета * зіма
   3) *Імя галоўнага героя твора.*
- Костусь * Янка *Міхал.

2. ***Якія пачуцці ўзнікаюць у Костуся пры сустрэчы з рэчкай і прыродай? Пацвердзіце гэта радкамі з тэксту.***

| Пачуццё | Радкі з тэксту |
|---|---|
| Замілаванасць | “Чым яна так хлопцу міла” -131 |
| Радасць | “І сам сабе ён засмяецца” -131<br>“Расце, гарыць душа дзяціна |

| | |
|---|---|
| | І ўсе на свеце забывае,<br>І шчасце, радасць спажывае” -140 |
| Смеласць | “Але нястрашны і знаёмы<br>Для хлопца гэтыя надломы.”-132<br>“Але пара, пара за дзела!<br>І ён на рэчку сходзіць смела.”-139 |
| Цікавасць | “І між марозам і вадою<br>Такія справы вынікаюць,<br>Што надта Костуся займаюць” -133<br>“У малюнкі так ён углыбляўся,<br>Што ў іншы свет перабіраўся.”-136 |
| Шкадаванне | “Пагнуў вас снег, мае хваінкі.<br>Эх вы, гаротныя націнкі!”-138 |
| Сумненне | “Пачне сапраўды сумнявацца,<br>Што гэта іней так з вадою<br>Вядзе размову тут зімою”. -140 |

3. ***Якія якасці фарміруюцца ў Костуся пры ўзаемадзеянні з прыродай?***
   ______________________________________________________________
4. ***Над якімі загадкамі-цудамі прыроды разважае Костусь?*** _________
   ______________________________________________________________
5. ***Пры характарыстыцы марозу Я.Колас выкарыстоўвае мноства назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў. Запішыце іх у табліцу.***

| **назоўнікі** | **прыметнікі** | **дзеясловы** |
|---|---|---|
| | | |

6. ***Вызначце чацвёртае “лішняе” ў кожным радзе. Абгрунтуйце (дакажыце) сваю думку.***

- Костусь, Антось, Міхал, Іван
- “рве цiскi”, “злізвае лёд”, “гаворыць смела”, “жывая сіла”, няма

7. ***Якi сродак мастацкай выразнасцi (выдзелены ў тэксце) выкарыстаны аўтарам для стварэння непаўторнай карцiны зімовага лесу?***
   *эпітэты *параўнанне *фальклорныя эпітэты

   А маладзенькія ялінкі
   Пад белым пухам чуць заметны;

Яны так мілы, так прыветны,
Бы тыя ***красачкі-дзяўчаткі,***
Надзеўшы гожыя апраткі.
Затое ж хвоечкі малыя
Стаяць, ***як сіраты якія,***
Ад снегу выгнуўшысь дугою,
На дол прыпаўшы галавою.

8. ***Назавіце моўныя выяўленчыя сродкі (эпітэты і параўнанні), пры дапамозе якіх Я.Колас стварае маляўнічую карціну зімовага лесу. Прывядзіце прыклады зтэксту.*** ________________________________

________________________________________________________________

9. ***У якім значэнні ўжыта ў вершы выдзеленае слова?***

І вось надарыцца часамі
Мароз над усімі маразамі;
Ідзе сярдзіта, пагражае,
Па даху ***гонтамі*** страляе…

*ледзяная глыба
*маленькі асколачак чаго-небудзь разбітага
*невялікія дошчачкі для пакрыцця даху дома.

***10. Адзначце лічбамі парадак дзеяння ў творы.***

*Марозік крэпіць, лёд таўшчэе,
І рэчка вольная нямее,
Да дна вадзіца прамярзае
І ходу, бедна, не мае.

*дык вось чым рэчка хлопцу міла,
Чым так яго прываражыла.

*А па кустах, па абалоні,
Ціскі парваўшы і супоні,
Вада шырока разальецца,
І снег на кашу пабярэцца.

*Ніхто з дамашніх не згадае,
Чым рэчка Костуся займае,

Якая іх звязала сіла
І чым яна так хлопцу міла.

**Фізкультхвілінка.**

Ой, зіма, зіма, зіма!***(пляскаюць у далоні)***
Весялей цябе няма ***(нахілы)***
Рыпіць сняжок, мароз і лёд! ***(прысяданне)***
Сумёты снегу! Новы год ***(развесці рукі)***
Мароз лютуе! Белы снег! ***(рукі ўверх)***
Колькі радасці ва ўсіх! ***(пляскаюць у далоні)***

**V. Дамашняе заданне.**

С. 141, пыт. 3.

*Дадатковае заданне:* да прапанваных вершаваных радкоў Я.Коласа падбярыце адпаведнікі з урыўка "На рэчцы".

| | |
|---|---|
| –Мамачка-галубка! –<br>Просіць сын так міла, -<br>Можа б ты на рэчку<br>Пагуляць пусціла? | |
| На плячо – сякерку,<br>Саначкі – у руку,<br>Хлеба ўзяў акрайчык,<br>– Цюцік! – свіснуў Жуку. | |
| На рачулцы ў лесе<br>Меў Алесь забаву.<br>Ну ж і пацяшаўся<br>Хлопчык тут на славу! | |
| Побач той рачулкі<br>Кучы буралому,<br>І застыла рэчка<br>Мёртва, нерухома. | |
| Радасць і раздолле<br>Хлопчыку малому,<br>І не пазайздросціць<br>Ён цяпер нікому! | |

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

Выстаўленне адзнак, іх каменціраванне.

Рэкламаванне найбольш удалых адказаў вучняў.

**VII. Рэфлексія.**

- Запішыце па памяці працяг радка:

**"І вось надарыцца часамі…"**

Узаемаправерка (с.134)

- *Дзякуй за працу!*